**Палулех, З.** З кагорты патомных афіцэраў / З. Палулех // Браслаўская звязда. — 2007. — 14 лют. — С. 3.

**З кагорты патомных афіцэраў**

*3339 дзён і начэй у 1979–1989 гг. тысячы савецкіх ваеннаслужачых выконвалі свой інтэрнацыянальны абавязак у Афганістане. З нашага раёна праз пекла той вайны прайшлі 105 салдат і афіцэраў. 15 лютага мы ўшаноўваем памяць загінуўшых воінаў-інтэрнацыяналістаў. Але сярод нас сёння жывуць сведкі і ўдзельнікі тых далёкіх і крывавых падзей. Мой расказ пра Анатоля Віктаравіча Міласердава, які служыў у ДРА без малога два гады.*

Афганістан стаіць асобнай старонкай у ваеннай біяграфіі Анатоля Віктаравіча. У чэрвені 1986 г. гэта краіна сустрэла беларускага афіцэра невыноснай амаль 50-градуснай спякотай. З Кабула напачатку трапіў у Джалалабад, адтуль на граніцу з Пакістанам, дзе служыў у асобным мотастралковым батальёне. Асноўнай місіяй савецкіх ваеннаслужачых на гэтым участку было прыкрыццё мяжы ад пранікнення з краіны-суседкі ў Афганістан душманаў, удзел у баявых дзеяннях па ачыстцы тэрыторыі правінцыі Кунар. Баявое хрышчэнне А. Міласердаў атрымаў амаль адразу па прыбыцці на месца службы. Малавопытны, неабстраляны афіцэр прымаў у сваё падпарадкаванне роту, пастроіў салдат і нават не паспеў паставіць перад імі баявую задачу, як падраздзяленне трапіла пад абстрэл рэактыўнымі снарадамі. На шчасце, яму своечасова ўдалося вывесці сваіх падначаленых з зоны абстрэлу.

Пазней даводзілася ўдзельнічаць у баявых аперацыях у Паншэрскай цясніне, у Гардэскай аперацыі, якая працягвалася 1,5 месяца. Гэта былі жудасныя падзеі. Здараліся дні, калі на паселішча, дзе стаяла часць, клаліся да 300 снарадаў за дзень. З часам Анатоль Віктаравіч нават навучыўся вызначаць траекторыю снарада па яго свісце. Не абыходзілася, вядома, без ахвяр. Смерць баявых таварышаў, мірнага насельніцтва заўсёды была вялікай стратай і болем. Да яе немагчыма было прывыкнуць. Аднойчы ў час руху ў калоне на вачах саслужыўцаў на фугаснай міне падарвалася бронемашына, якая ішла наперадзе. Менавіта тады капітан Міласердаў атрымаў лёгкую кантузію. Але гэта было нішто ў параўнанні з тым, што перажылі пасажыры той БМП.

Роту, якую ўзначальваў А. Міласердаў, неаднойчы прызнавалі адной з лепшых у 66 асобнай мотастралковай брыгадзе па баявой падрыхтоўцы, і як вынік, нясла значна меншыя страты ў жывой сіле. На другім годзе службы Анатоля Віктаравіча перавялі на пасаду старшага памочніка начальніка аператыўнага аддзела па дэсанціраванні. Кожныя два тыдні – удзел у баявых дзеяннях. Адказнасць за людзей, якія былі побач, узрасла. Але менавіта ў той перыяд з роты А. Міласердава загінулі адразу дзесяць маладых салдат, якія ляцелі на верталёце здымаць заслонныя пасты і былі збіты «сцінгерам». Здарылася гэта трагедыя на вачах саслужыўцаў, але ніхто дапамагчы не мог.

Успаміны пра тыя падзеі і сёння балюча трывожаць душу Анатоля Віктаравіча. Асобным напамінам пра іх і баявых таварышаў з'яўляюцца два ордэны – «За службу Радзіме» і «Звязда» 2-ой ступені, юбілейныя медалі. А яшчэ Афганістан запомніўся невыноснай спякотай, заснежанымі гарамі, мноствам малпаў, бананаў, апельсінаў. Запомніліся і сустрэчы з зоркамі эстрады В. Лявонцьевым, А. Пугачовай, А. Разенбаўмам.

Служба ў, складзе абмежаванага кантынгента ў ДРА загартавала кадравага афіцэра, але не зрабіла яго жорсткім. Ён годна выканаў свой інтэрнацыянальны абавязак.

Патомнаму афіцэру было, магчыма, лягчэй за іншых прыстасоўвацца да ваеннай службы. Анатоль Віктаравіч свядома звязаў свой лёс са службай радзіме. Ён выбраў для сябе прафесію афіцэра, бо вырашыў не адступаць ад традыцыі продкаў-мужчын. Некалі яго прадзед быў царскім генералам. Абодва дзяды камандавалі ў гады Вялікай Айчыннай вайны артылерыйскімі батарэямі і аддалі сваё жыццё за наша светлае будучае. Бацька служыў у Камітэце дзяржбяспекі напачатку ў Грозненскай вобласці ў Чачэна-Інгушскай АССР, дзе і нарадзіўся Анатоль, затым у Азербайджане. Менавіта там А. Міласердаў паступіў і паспяхова закончыў Бакінскае вышэйшае агульнавайсковае каманднае вучылішча. Першым яго месцам службы стала Венгрыя, а ўжо з 1982 года – Беларусь. На Браслаўшчыну Анатоль Віктаравіч трапіў у 1990 г. Менавіта нашы цудоўныя мясціны сталі для яго і сям'і роднымі. Дваццаць пяць гадоў суправаджае яго па жыцці верная спадарожніца Валянціна Васільеўна, якая не на словах, а на справе даказала мужу сваю вернасць і адданасць.

А. Міласердаў і цяпер, калі стаў афіцэрам запасу, не згубіў армейскай выпраўкі, моцы характару, і працягвае быць на службе, толькі ўжо на службе бяспекі людзей на вадзе, узначальвае раённае таварыства АСВОД.

**З. Палулех**